***Паборцава К. В.***

# ВОБРАЗЫ НІЖЭЙШАЙ МІФАЛОГІІ Ў ЗАПІСАХ ФАЛЬКЛАРЫСТАЎ XIX СТ.

*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны*

*(Паступіў у рэдакцыю15.09.2022)*

Вывучэнне народных вераванняў, што датычаць персанажаў ніжэйшай міфалогіі, дапамагае раскрыць светапогляд беларусаў, тым больш, што многія вобразы «калісьці былі звязаны з язычніцкімі рэлігійнымі ўяўленнямі старажытных славян і адлюстроўвалі цэласную сістэму поглядаў нашых продкаў на сусвет» [1, с. 4]. Мэтай дадзенага даследавання з’яўляецца аналіз асобных прац фалькларыстаў-збіральнікаў XIX ст., прысвечаных міфапаэтычным уяўленням беларусаў. Адна з пастаўленых задач – разгледзець найбольш значныя працы, характэрныя для акрэсленага ў артыкуле першага гістарычнага перыяду развіцця навуковай думкі па праблеме вывучэння міфалагічнай прозы беларусаў.

У гісторыі збірання і даследавання звестак па міфалагічнай прозе беларусаў вызначаецца некалькі перыядаў, адзін з якіх, з’яўляючыся першапачатковым, ахоплівае 1873 – 1912 гг. Менавіта ў гэты перыяд назіраецца актыўны працэс збірання, сістэматызацыі, назапашвання і публікацыі звестак па вобразах народнай дэманалогіі беларусаў. Каштоўныя матэрыялы па персанажах ніжэйшай міфалогіі былі прадстаўлены фалькларыстамі-збіральнікамі М. Я. Нікіфароўскім, Е. Р. Раманавым, М. М. Косіч, А. Я. Багдановічам і іншымі. Апублікаваныя гэтымі даследчыкамі звесткі па міфалагічнай прозе на старонках у свой час выдадзеных зборнікаў з’яўляюцца надзвычай важнымі крыніцамі, а таксама першымі тэарэтычнымі даследаваннямі (А. Я. Багдановіч) і для разумення сутнасці старажытных вераванняў продкаў, і для параўнання з сучаснымі запісамі звестак па ніжэйшых міфалагічных персанажах, і для асэнсавання

асаблівасцей эвалюцыі светапогляду беларусаў, і для высноў аб устойлівым характары бытавання і захавання да цяперашняга часу ўяўленняў пра міфалагічных істот.

Найперш засяродзім увагу на асобе М. Я. Нікіфароўскага і яго працы «Нечистики, свод простонародных в Витебской Белоруссии сказаний о нечистой силе» (Вільна, 1907 г., «Виленский временник», кн. 2, с. 3 – 103). Як слушна адзначыла Т. В. Валодзіна ў пасляслоўі да перавыдання вышэйназванай кнігі (Віцебск, 1995 г.), «упершыню М. Я. Нікіфароўскі зрабіў і сістэматычнае навуковае апісанне беларускай дэманалогіі, абапіраючыся на народныя легенды і паданні – “Нячысцікі. Звод простанародных у Віцебскай Беларусі паданняў пра нячыстую сілу”. Перад чытачамі прадстала шырокая панарама нячысцікаў “усіх рангаў і званняў”» [2, с. 82]. Заслугай М. Я. Нікіфароўскага з’яўляецца зробленая ім класіфікацыя персанажаў ніжэйшай міфалогіі, якіх аўтар падзяліў на паўсюдных, вольных нячысцікаў, чалавекападобнікаў і дэманападобнікаў, падрабязна ахарактарызаваўшы іх у межах кожнай з груп.

Надзвычай карыснай з’яўляецца інфармацыя пра сядзібных (дамавікі, хлеўнікі, гуменнікі, лазнікі, кікімары і інш.), а таксама пазасядзібных (палевікі, лесавікі, вадзянікі, балотнікі, русалкі і інш.) нячысцікаў. Пададзеныя аўтарам звесткі пра персанажаў ніжэйшай міфалогіі ўтрымліваюць асноўныя кампаненты схемы іх апісання, характарыстыкі (іпастасі, месца знаходжання, функцыянальнасць, узаемаадносіны і інш.), што актуальна як для вырашэння праблемы параўнальнага даследавання вобразаў (маецца на ўвазе выяўленне асаблівасцей эвалюцыі ў працэсе бытавання народных вераванняў, звязаных з тым ці іншым персанажам, а таксама высвятленне характару ўстойлівасці іх захавання ў народнай памяці пры параўнанні з сучаснымі запісамі тэкстаў адпаведных прымхліц), так і для назіранняў за рэгіянальна-лакальнай спецыфікай (калі мець на ўвазе, напрыклад, такія рэгіёны Беларусі, як Віцебшчына і Гомельшчына). Каштоўнасць працы М. Я. Нікіфароўскага заключаецца ў тым, што аўтарам

зроблена спроба ўпарадкаваць персанажы ніжэйшай міфалогіі, прадставіць іх у пэўнай сістэме, што важна для метадалогіі навуковых даследаванняў, звязаных у дадзеным выпадку з вывучэннем народнай дэманалогіі.

У зборніку М. М. Косіч «Литвины-белорусы Черниговской губернии, их быт и песни» змешчаны сціслыя звесткі пра такі персанаж, як ведзьма. Аўтарам звернута ўвага на спосабы засцярогі ад звышнатуральнага ўздзеяння ведзьмы на Купалле: «Напярэдадні Купалы кожны гаспадар вязе ці нясе выкапаную з коранем асіну і кладзе на вароты. У гэтую ноч ходзяць ведзьмы, якія баяцца толькі асінавага кала. З той жа прычыны гаспадыня кладзе звечара крапіву-пякучку на фортку – “штоб ведзьма пастрыкала морду, як будзя лезць”» [3, с. 56].

У 8 томе «Белорусского сборника», які выйшаў у 1912 г., Е. Р. Раманавым прадстаўлены звесткі пра такіх персанажаў ніжэйшай міфалогіі, як дамавік, русалка, лазнік, лесавік, вадзянік, чорт. Даследчык звярнуў увагу, напрыклад, не толькі на знешні выгляд дамавіка, падкрэсліўшы, што гэта «чалавекападобная істота, чорная, пакрытая валасамі» [4, с. 288], але і на вар’іраванне яго месцазнаходжання: «Месца жыхарства яго ў доме вызначаецца па-рознаму: на печы, пад печкаю, пад падлогаю, у хлявах і іншых забудовах, дзе размяшчаецца скаціна» [4, с. 288]. Прыведзенае апісанне дае падставы сцвярджаць: Е. Р. Раманавым была звернута ўвага на тое, што інфарманты іншы раз не раздзялялі такіх істот, як дамавік і хлеўнік (у сучасных запісах прымхліц таксама назіраецца падобная з’ява) – «у апошнім выпадку дамавы дух змешваецца з Хлеўнікам» [4, с. 288].

Е. Р. Раманаў прывёў звесткі пра засцярогу хлява ад шкодных дзеянняў дамавіка, функцыянальнасць якога ідэнтычная дзеянням хлеўніка: «Каб абясшкодзіць Дамавіка, застрэльваюць у першы дзень каляд, 25 снежня, ці ў дзень Новага года, да абедні, сароку ці варону і, зачапіўшы вяровачкай за горла, вешаюць яе ў хляве» [4, с. 288]. Заўважым, што ў сучасных запісах звестак пра дамавіка, якога іншы раз жыхары таксама ідэнтыфікуюць з хлеўнікам, гучыць аналагічны спосаб засцярогі ад яго злоснага ўздзеяння.

Выклікаюць цікавасць звесткі пра ведзьму, прадстаўленыя Е. Р. Раманавым у 8 выпуску «Белорусского сборника», паводле якіх можна больш шырока ахарактарызаваць функцыянальнасць гэтага персанажа: «У ноч перад Іванам ведзьмы, ведзьмары і іншая нячыстая сіла выходзяць са сваіх трушчоб і ахоўваюць скарбы, наведваюцца на даржнікі, дзе адбіраюць малако; залазяць туды, дзе захоўваюць малочныя прадукты – у лядоўні, склепы, і здымаюць там смятану; залазяць у свірны і робяць збожжа няспорным; робяць на жытнёвых нівах заломы – каб у жней laміла ногі, спіны і рукі, а ў тых, хто будзе есці хлеб з такой нівы, – рабіліся курчы; зажынаюць – каб збожжа было неўмалотнае і г. д.» [4, с. 212]. У прыведзеным апісанні ведзьмы, зробленым даследчыкам, заяўлены даволі шырокі набор яе функцый. У сучасных запісах міфалагічных звестак, напрыклад на Гомельшчыне, пра гэты персанаж сустракаюцца ў асноўным матывы, звязаныя з адбіраннем ведзьмай малака ў кароў і яе імкненнем нашкодзіць ніве, зрабіць там заломы. Каштоўнасць запісаў Е. Р. Раманава, прысвечаных вобразам народнай дэманалогіі, бясспрэчная. Параўнанне фактычных матэрыялаў, запісаных у мінулым, з тэкстамі прымхліц, зафіксаваных у наш час, дазваляе зрабіць высновы аб стане народнай памяці, устойлівасці захавання асобных «партрэтных элементаў» міфалагічных істот і страце некаторых, эвалюцыі светапогляду беларусаў.

Калі вышэйназваныя працы збіральнікаў-даследчыкаў М. Я. Нікіфароўскага, М. М. Косіч, Е. Р. Раманава можна аднесці да крыніц, дзе прадстаўлены ўзоры запісаў міфалагічнай прозы беларусаў, то кніга «Пережитки древнего миросозерцания у белорусов» А. Я. Багдановіча ўяўляе сабой манаграфічнае даследаванне народных вераванняў, у тым ліку і анімістычных, якія глыбока раскрыты аўтарам падчас аналізу асобных вобразаў ніжэйшай міфалогіі. Да ліку апошніх адносяцца найперш сядзібныя боствы: чур, хатнік або дамавік, ёўнік і лазнік, хлеўнік. Асобна разгледжаны аўтарам вобразы стыхійных боставаў, якія, на яго думку, увасабляюць сілы прыроды. Гэта вадзянік, русалка, лесавік, падвей. Знаёмячы з вадзяніком і

падкрэсліваючы, што ён жыве ў «жывой» вадзе, якая «толькі што прабілася з-пад зямлі» [5, с. 76], А. Я. Багдановіч адзначае, што, зыходзячы з павер'яў, захавалася меркаванне: менавіта гэтая істота патрабуе чалавечай ахвяры [5, с. 76]. Характарызуючы вобраз русалкі, даследчык звяртае ўвагу на генезіс гэтага персанажа: «Існуе павер'е, што душы дзяцей, памерлых да хрышчэння, ператвараюцца ў русалак» [5, с. 77].

Аналізуючы вобраз ведзьмы, А. Я. Багдановіч, як і Е. Р. Раманаў, засяродзіў увагу на яе шкодных функцыях, адна з якіх – адбіранне малака ў кароў, невыпадкова, спасылаючыся на народныя павер'і, даследчык назваў гэтую істоту «ведзьмай-кароўніцай» і раскрыў сутнасць матыву, звязанага са збіраннем ведзьмай у купальскую ноч расы: «…ведзьма ў купальскую ноч ходзіць па агародах, збірае цадзілкаю расу ў даёнку, дае яе піць сваім каровам і абмывае ім расою вымя. Праз гэта знікае малако ў тых гаспадароў, у якіх ведзьма сабрала расу» [5, с. 113 – 114].

Акрэслены А. Я. Багдановічам спосаб ператварэння чалавека ў ваўка («Каб пераўвасобіцца ў ваўка, трэба трэйчы перавярнуцца цераз нож, уторкнуты ў зямлю, вымаўляючы пры гэтым асаблівае закляцце») [5, с. 145] пацвярджаецца шматлікімі сучаснымі запісамі прымхліц. Даследчык гаворыць і пра такі спосаб ператварэння, як вяртанне чалавечага аблічча: «Калі такі воўк уволю нап'ецца чалавечай крыві і захоча зноў стаць чалавекам, ён павінен тройчы перавярнуцца праз той жа нож, але ў адваротны бок. А калі хто-небудзь падсцеражэ гэтыя ператварэнні і ў адсутнасць Ваўкалака вырве нож з зямлі, то Ваўкалак так назаўсёды і застанецца ваўком» [5, с. 145]. А. Я. Багдановіч, раскрываючы сутнасць дэманалагічнай прыроды нячысцікаў, у кожным выпадку імкнуўся прадэманстраваць паэтычнасць светапогляду беларусаў, багацце іх фантазіі.

Такім чынам, праведзены аналіз развіцця навуковай думкі ў першы гістарычны перыяд (1873 – 1912) па праблеме збірання звестак па персанажах ніжэйшай міфалогіі і іх асэнсавання дае падставы зрабіць высновы аб тым, што менавіта ў гэты час фарміруецца першапачатковая база даных па

вобразах народнай дэманалогіі і закладваюцца асновы метадалогіі іх даследавання. Нягледзячы на апісальны характар прац фалькларыстаў-збіральнікаў гэтага перыяду, каштоўнымі застаюцца іх назіранні і высновы адносна бытавання народных вераванняў, звязаных з вобразамі народнай дэманалогіі, а таксама спробы даследчыкаў абазначыць важныя кампаненты ў схеме апісання персанажаў.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Беларуская міфалогія / уклад. У. А. Васілевіч. – Мінск : Універсітэцкае, 2001. – 208 с.
2. Валодзіна, Т. В. Пасляслоўе / Т. В. Валодзіна // Нечистики, свод простонародных в Витебской Белоруссии сказаний о нечистой силе / Н. Я. Никифоровский. – Витебск, 1995. – С. 79 – 85.
3. Косич, М. Н. Литвины-белорусы Черниговской губернии, их быт и песни / М. Н. Косич. – СПб. : Тип. кн. В. П. Мещерского, 1902. – 113 с.
4. Романов, Е. Р. Белорусский сборник / Е. Р. Романов. – Вильно : Тип. А. Г. Сыркина, 1912. – Вып. 8. Быт белоруса. – 595 с.
5. Богданович А. Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов : этнографический очерк / А. Е. Богданович. – Гродно : Губернская тип., 1895. – 186 с.


РЕЗЮМЕ


В статье анализируются труды фольклористов-собирателей XIX в., посвящённые изучению мифологической прозы белорусов. Особое внимание сосредоточено на изданиях Н. Я. Никифоровского, Е. Р. Романова, М. Н. Косич, А. Е. Богдановича, в работах которых нашли отражение народные верования, связанные с персонажами низшей мифологии.


SUMMARY


The article analyzes the works devoted to the study of the belorussian mythological prose and collected by the folklorists in the XIX century. Particular attention is focused on the publications of N. Ya. Nikiforovsky, E. R. Romanov, M. N. Kosich, A. E. Bogdanovich, whose works reflected folk beliefs connected with the lower mythology characters.